**Пілецкі В.А. Першабытны лад у гісторыі Беларусі // Гісторыя: праблемы выкладання. 1999, №3. С.6–24.;**

( *працяг артыкула*) у №4, за 1999 г., С.3–13;





# ЗМЕСТ АДУКАЦЫІ І МЕТАДАЛОГІЯ

***Віктар Пілецкі**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

# Першабытны лад у гісторыі Беларусі

У школьным курсе "Гісторыя Беларусі" (V кл.) I і II разделы прысвечаны пражыванню людзей у каменным, бронзавым і жалезным вяках. Пры іх вывучэнні прадугледжваецца асвятленне складаных праблем жыцця першабытнага грамадства на тэрыторыі нашай краіны. Настаўнік гісторыі павінен засяродзіць увагу пяцікласнікаў на базавых паняццях: кліматычныя ўмовы, сацыяльны лад, эвалюцыя родаплемянных адносін, культура і інш. Артыкул дапаможа настаўнікам глыбей асэнсаваць супярэчлівыя працэсы, што адбываліся ў глыбокай старажытнасці і папоўніць веды вучняў фактычным матэрыялам па названай праблематыцы з улікам сучасных дасягненняў у гістарычнай навуцы.

## 1. Характарыстыка эпохі першабытнага грамадства. Засяленне

Першабытны лад у гісторыі чалавецтва — адзін з самых працяглых па часе. Ён ахоплівае перыяд ад выдзялення чалавека з жывёльнага асяроддзя да ўзнікнення класавага грамадства. Асноўны змест гісторыі гэтага перыяду ўключае, **па-першае**, працэс станаўлення чалавека, або, як гавораць інакш, працэс антрапагенезу. Гэта перыяд, калі з малпы-прымата як з прадстаўніка вышэйшай формы арганізацыі

жывёльнага свету пастулова сфарміраваўся чалавек з уласцівымі яму якасцямі: высокаразвітым мысленнем, гукавой мовай, уменнем ствараць прасцейшыя прылады працы.

**Па-другое**, важным аспектам зместу гісторыі першабытнага грамадства з'яўляецца развіццё грамадскіх прадукцыйных сіл, які прайшоў у сваім станаўленні шлях ад прысваення чалавечым грамадствам прадуктаў, што знаходзяцца ў гатовым стане ў прыродзе, да адносна высокаарганізаванай грамадскай вытворчай гаспадаркі, спецыялізаванай па важнейшых галінах вытворчасці, такіх як жывёлагадоўля, земляробства і інш.

**Па-трэцяе**, гісторыя першабытнага грамадства — таксама гісторыя станаўлення і развіцця першых стадый грамадскіх адносін. Эвалюцыя разгортваецца па шляху трансфармацыі прымітыўнай формы адносін першабытнага статку, пабудаванай на законах жывёльнага свету, спачатку да абшчыннай арганізацыі з яе роднаснай сувяззю паміж асобнымі членамі грамадства, а затым да зараджэння тэрытарыяльна-суседскіх адносін, якія грунтуюцца на эканамічнай базе і ўпраўляюцца прымітыўна-класавай надбудовай.

Пачатак першабытнага ладу на Беларусі звязаны са з'яўленнем тут першых людзей, што адбылося ў старажытнакаменным веку — сярэднім палеаліце (эпоха мусцье), прыблізна 100—40 тыс. гадоў да н.э. Матэрыяльным сведчаннем знаходжання чалавека той пары на тэрыторыі нашай краіны з'яўляюцца, галоўным чынам, крамянёвыя адшчэпы з яўнымі слядамі мэтанакіраванай апрацоўкі, знойдзеныя ў Падняпроўі каля вёсак Абідавічы і Падлужжа (Быхаўскі раён), Свяцілавічы (Веткаўскі раён), Клеявічы (Касцюковіцкі раён). Гэта былі прымітыўныя прылады працы, выкананыя спосабам, характэрным для той эпохі.

Жыццё чалавека і грамадства (як у наш час, так і ў старажытнасці) заўсёды было абумоўлена кліматычнымі ўмовамі. Менавіта яны прадвызначылі больш позняе засяленне асноўнай часткі еўрапейскага рэгіёна, куды тэрытарыяльна ўваходзіць

і Беларусь, у параўнанні з афрыканскім кантынентам і іншымі жыццёва-спрыяльнымі тэрыторыямі.

Клімат перыяду палеаліту на тэрыторыі нашай Беларусі вызначаўся перыядычнымі глабальнымі зніжэннямі тэмпературы навакольнага асяроддзя працягласцю па некалькі тысячагоддзяў, што атрымалі назву зледзяненняў ці ледавіковых эпох. Амаль уся тэрыторыя еўрапейскага кантыненту, пачынаючы з Поўначы, пакрывалася тоўстым покрывам вечнай мерзлаты. Паміж зледзяненнямі былі перыяды міжледавікоўяў, у час якіх клімат станавіўся прыдатным для жыцця людзей. На працягу аднаго з такіх перыядаў — Муравінскага міжледавікоўя, якое працягвалася пятнаццаць тысяч гадоў (з 110 да 95тыс. гадоў назад) — па меркаванні вучоных, і з'явіўся першы чалавек на тэрыторыі нашай краіны. Аднак не выключана, што ён бываў тут і ў аналагічныя папярэднія перыяды.

Старажытнейшымі людзьмі на Беларусі, калі меркаваць па прыладах працы, былі палеантрапы, у навуковым асяроддзі іх яшчэ прынята называць неандэртальцамі, згодна з назвай населенага пункта Неандэрталь у Германіі, дзе былі ажыццёўлены першыя найбольш значныя знаходкі гэтага тыпу. Неандэртальцы былі непасрэднымі папярэднікамі сучасных людзей і ўяўлялі пераходны этап ад прадстаўнікоў жывёльнага свету да чалавека.

Іх знешні выгляд захоўваў мноства звярыных рысаў. Яны мелі невысокі рост (прыблізна 160 см), доўгія пярэднія канечнасці, што звісалі амаль да самай зямлі, шырокія плечы, значна шырэйшыя чым у сучаснага чалавека, і твар, густа пакрыты валасяным покрывам, на якім моцна наперад выступалі надброўныя дугі і сківіца — сведкі іх адносна нядаўняга жывёльнага мінулага.

Характар жыцця людзей тыпу палеантрапа на Беларусі вызначаўся ўласцівымі ім відамі дзейнасці. Старажытнейшымі іх заняткамі былі: збіральніцтва, паляванне і рыбная лоўля. Неандэртальцы пераходзілі з месца на месца ў пошуках ежы, выкопваючы салодкія карані, спажываючы плады дрэў і іншыя прыдатныя для харчаваня прадукты.

Паўкачавы прысвойваючы лад жыцця першых насельнікаў нашай краіны поўнасцю залежаў ад наяўнасці расліннай і жывёльнай ежы ў навакольнай мясцовасці. У іерархіі заняткаў паступова важнейшым станавілася загоннае паляванне. Гэты від дзейнасці, на думку вучоных, больш за астатнія спрыяў трансфармацыі малпы ў чалавека.

Увогуле, збіральніцтва, паляванне, і рыбная лоўля ў іх старажытнейшым выглядзе не патрабавалі ўласна чалавечых якасцяў. Яны даступныя і вышэйшым прадстаўнікам жывёльнага свету. Загоннае паляванне было найбольш прадуктыўным відам дзейнасці, што абумовіла яго жывучасць сярод заняткаў чалавека, але ў той жа час яно патрабавала папярэдніх дамоўленасцяў паміж удзельнікамі. Іншымі словамі, загоннае паляванне прымушала палеантрапа думаць і размаўляць. А гэта развівала як самога чалавека, так і чалавечае грамадства у цэлым. Каб жыць, чалавек павінен быў займацца загонным паляваннем, а яно ўплывала на яго развіццё. Фарміраванне гукавой мовы, па меркаванні даследчыкаў, ішло на працягу гістарычна вялікага перыяду шляхам удасканалення складаных рухальных і гукавых формаў сігналізацыі, існаваўшых ужо ў вышэйшых жывёл (антрапоідная малпа), а завяршылася на стадыі краманьёнца, які змяніў неандэртальца на абшарах Еўропы каля 40 тыс. гадоў да н.э.

Загоннае паляванне акрамя мяса як высокакаларыйнага прадукту харчавання, наяўнасць якога станоўча ўплывала на фізіялагічнае развіццё, давала чалавеку косці буйных жывёл (мамантa, шарсцістага насарога і інш.), што служылі выдатным матэрыялам пры абсталяванні месцаў пражывання ва ўмовах халоднага клімату. Старажытнейшыя знаходкі жытлаў першабытных людзей на тэрыторыі былога СССР адносяцца да эпохі мусцье.

Асноўнай формай прылад працы перыяду сярэдняга палеаліту былі востраканцовыя рубячыя, рэжучыя і колючыя інструменты. Іх з'яўленне было абумоўлена неабходнасцю выкарыстання на паляванні, пры распрацоўцы шкур дзікіх жывёл і

для выкопвання карэнняў у час збіральніцтва. Гэта былі скрэблы, нажы, праколкі, скобелі і іншыя прылады, выкананыя з крэйдавага крэменю шляхам здымання з жэлвака (своеасаблівай загатоўкі) шырокіх тонкіх пласцін і апрацоўкі іх вынайдзеным прыблізна ў той час і шырока распаўсюджаным тэхнічным прыёмам рэтушавання.

Адным з найбольш важных дасягненняў чалавечай супольнасці ў названы гістарычны перыяд было таксама вынаходніцтва, ці, дакладней, першагістарычнае асваенне, агню. Узяўшы ў рукі агонь, чалавек змог гатаваць ежу, абараняць сябе і сваё жытло ад холаду, атрымаў многа іншых магчымасцяў і нават змог стаць непераможным для сваіх галоўных супернікаў у прыродзе — дзікіх драпежных жывёл, якія ўяўлялі пастаянную небяспеку для яго жыцця.

Здабыча агню, разам з вынаходніцтвам спецыяльных спосабаў апрацоўкі крэменю для стварэння прылад працы і асваеннем загоннага палявання, з'явілася магутным крокам на шляху паступовага ўдасканалення першабытнага чалавека і далейшай гістарычнай эвалюцыі чалавечага грамадства.

## 2. Сацыяльныя адносіны: праабшчына

У сацыяльным плане перыяд сярэдняга палеаліту характарызуецца вучонымі як час існавання першай формы грамадскага супольніцтва — чалавечага статку. У гэты час ішло станаўленне родавых адносін. Дзейнічала архаічная форма міжчалавечых сувязяў — праабшчына.

Менавіта на працягу развіцця праабшчыны, якая паступова перарасла (каля 40 тыс. гадоў да н.э.) у раннеродавы абшчынны сацыяльны лад, чалавецтва дасягнула важнейшых асаблівасцяў, што адрозніваюць грамадскую супольнасць ад папуляцыі жывёл. Сярод апошніх можна назваць мэтанакіраваную грамадскую дзейнасць, у адрозненне ад інстынктыўнай дзейнасці жывёл, і арганізацыю грамадскага харчавання, у якіх ужо былі прыкметы прасцейшых элементаў падзелу працы па полавых і ўзроставых прыкметах. Чалавек гэтага перыяду

ўжо ствараў адносна складаныя прылады, прызначаныя аблегчыць працэс здабывання асноўных прадуктаў жыццядзейнасці, чаго не маглі рабіць яго жывёльныя продкі. Зарадзілася гукавая мова, чалавечыя шлюбныя адносіны і мн. інш.

Колькасна праабшчына, як мяркуюць даследчыкі, была адносна невялікай. У яе уваходзіла каля 20—30 дарослых членаў разам з дзецьмі, таму што пракарміцца больш значнай супольнасцю пры тагачасным узроўні развіцця прадукцыйных сіл было немагчыма. У той жа час людзі не маглі пражыць і больш дробнымі калектывамі. У акружэнні суровых умоў жыцця, неабходнасці забяспечвацца харчаваннем, абараняцца ад дзікіх жывёл, застацца па-за межамі праабшчыны было раўназначна пагібелі.

У гэты ж час у чалавечым грамадстве ўзнікаюць першыя ідэалагічныя ўяўленні, а таксама рэлігія як адна з найбольш значных форм ідэалогіі. Найбольш раннімі доказамі наяўнасці ідэалогіі як сістэмы маральных, рэлігійных, эстэтычных і іншых поглядаў, у якіх адлюстроўваліся адносіны людзей да акружаючай іх рэчаіснасці, з'яўляюцца археалагічныя матэрыялы аб пахаваннях памерлых у перыяд рассялення неандэртальцаў.

Аб тым, што гэта былі не проста астанкі нейкага памерлага чалавека, а менавіта пахаванне, вучоныя даведаліся па наяўнасці прыкмет абраднасці. Сярод іх аднолькавае трупапалажэнне, знаходкі прадметаў дамашняга начыння або прылад працы ў магілах разам з нябожчыкамі і інш. Значыць, чалавек ужо ў час існавання чалавечага статку ці праабшчыны (прыблізна 100—40 тыс. гадоў да н.э.) дасягнуў дастатковага ўзроўню развіцця, калі змог усвядоміць сваё "я" і пачаў задумвацца над вырашэннем філасофскіх праблем накшталт праблемы замагільнага жыцця.

Узнікненне рэлігіі, відаць, адбылося прыблізна ў гэты ж час, а ішло яно, як лічаць даследчыкі, на анімістычнай аснове. Гістарычна першым з вядомых форм рэлігіі быў, верагодна, фетышызм. Прадметам нежывой прыроды, з'явам і жывёлам ва ўяўленні тагачасных людзей надаваліся чалавечыя якасці: душа, розум, пачуцці, свядомасць.

Шлюб эпохі праабшчыны застаецца дыскусійным пытаннем у сучаснай гістарычнай навуцы. Большасць даследчыкаў лічаць яго гістарычна першапачатковай формай праміскуітэт (беспарадкавыя полавыя адносіны ўнутры статку). Эвалюцыя шлюбу ішла па шляху замены праміскуітэту на аснове законаў звычаёвага права, групавым шлюбам экзагамнага характару. Пры ім дзейнічала забарона на адносіны паміж роднаснымі групамі з мэтай засцерагчы патомства ад кровазмяшэння.

Назіранні за практыкай размнажэння жывёльнага свету, даследаванні шлюбных адносін сучасных рэліктавых народаў афрыканскага кантыненту, вывучэнне жыцця папуляцый вышэйшых малпаў-прыматаў далі таксама падставу меркаваць, што ў дародавым грамадстве маглі выкарыстоўвацца і іншыя формы шлюбных адносін. Напрыклад, такія як гарэмныя сем'і, калектыўныя шлюбныя святы-оргіі, манагамныя адносіны і іншыя формы, што суіснавалі адначасова ў залежнасці ад канкрэтных абставін жыцця першабытнага статку.

## 3. Ранняя родавая арганізацыя грамадства

Каля 40 тыс. гадоў да н.э. чалавецтва перайшло ад праабшчыны да родавага ладу. Увогуле родавы лад на Беларусі меў два этапы свайго развіцця. Першы — эпоха раннеродавай абшчыны, у час якой ішло станаўленне родавых адносін. Другі — час развітой родавай абшчыны, які характарызаваўся высокім росквітам першабытна-абшчыннага ўкладу жыцця грамадства на базе высокаразвітой, спецыялізаванай у значнай ступені, прысвойваючай гаспадаркі. З гэтага часу грамадства паступова пераходзіць ад прысваення да вытворчасці, а разам з тым і да маёмаснай няроўнасці, якая была прадвесніцай класавага грамадства.

Першы з названых этапаў цягнуўся на працягу двух археалагічных перыядаў: апошняй стадыі старажытнакаменнага веку — верхняга палеаліту (40—10 тыс. гадоў да н.э.), мезаліту — сярэднекаменнага веку (9—5 тыс. гадоў да н.э.). Другі этап супадае з апошняй стадыяй эпохі каменю — новакаменным векам ці неалітам (5—2 тыс. гадоў да н.э.).

Ранняя родавая арганізацыя грамадства ў гісторыі чалавецтва адзначана новым крокам у развіцці сацыяльных адносін, далейшай эвалюцыяй грамадскай гаспадаркі, новым этапам развіцця прылад працы. Змяніўся нават тып чалавека. Каля 40 тыс. гадоў да н.э. тэрыторыю Беларусі засяляў ужо краманьёнец — чалавек сучаснага псіхафізіялагічнага складу.

Але адбывалася гэта далёка не хуткімі тэмпамі. Увесь завяршальны этап старажытнакаменнага веку, верхні палеаліт, на Беларусі яшчэ трымаліся халодныя кліматычныя ўмовы. Прыблізна з 95 тыс. да 10 тыс. гадоў таму назад цягнулася апошняе паазерскае (валдайскае) зледзяненне. Аднак яно ахапіла не ўсю тэрыторыю Беларусі як ранейшыя, а толькі паўночную яе частку да мяжы сучасных гарадоў Оршы, Лепеля, Докшыц. У паўднёвай Беларусі першабытнае насельніцтва працягвала пражыванне. Цяпер гэта была прыледніковая паласа з суровым кліматам, тундравай раслiннасцю і жывёльным светам, прадстаўленым мамантамі, шарсцістымі насарогамі, паўночнымі аленямі і іншымі буйнымі жывёламі.

Наяўнасць суровага прыледніковага клімату актывізавала людскія супольнасці да змагання за існаванне: паўстала пытанне адзення і пошуку ўкрыццяў ад холаду і дзікіх жывёл. Людзі пачалі будаваць жытлы, будаўнічым матэрыялам для якіх служылі скуры і косці буйных жывёл у спалучэнні з натуральнымі прыроднымі магчымасцямі: буйнымі валунамі, ярамі, крутымі берагамі ў поймах рэк і азёр.

Дзейнасць чалавечага грамадства на тэрыторыі нашай краіны на гэтым этапе прадстаўлена, у параўнанні з папярэднім перыядам, больш шырока. Археолагі нават знайшлі месцы адносна доўгатэрміновага пражывання тагачасных людзей, якія ў навуковым асяроддзі называюць стаянкамі. У Беларусі выяўлена дзве. Адна з іх непадалёку ад Прыпяці каля вёскі Юравічы Калінкавіцкага раёна, а другая каля ракі Сож паблізу сучаснага паселішча Бердыж Чачэрскага раёна. Яны адносяцца да разраду познепалеалітычных, пражыванне першабытных людзей, вызначанае з дапамогай сучасных метадаў даследа-

вання, зафіксавана прыблізна каля 26 тыс. гадоў назад на Юравіцкай і адпаведна 23 тыс. гадоў на Бердыжскай стаянках. Знойдзены паглыбленыя ў зямлю з рэшткамі вогнішча жыллёвыя пабудовы авальнай формы, што выконваліся па тыпу юрты. Іх памеры склалі прыблізна 4x5 і 5x7 метраў. Асноўным будаўнічым матэрыялам служылі буйныя валуны, трубчатыя косці і чарапы мамантаў. Яны, на думку вучоных, служылі сценамі, якія хутчэй за ўсё пакрываліся скурамі буйных жывёл.

Вялікая колькасць прадметаў жыццядзейнасці той эпохі і адносна тоўсты слой агнішча сведчаць аб працяглым знаходжанні людзей на адным месцы. Непадалёку ад жытлаў знойдзены гаспадарчыя ямы, у якіх, відаць, захоўваліся рэшткі харчавання здабытага жыхарамі мясцовай раннеродавай абшчыны.

Наяўнасць вялікай колькасці касцей буйных жывёл, такіх як мамант, знойдзеных на названых месцах пражывання людзей у Беларусі, дае падставу меркаваць, што адным з важнейшых заняткаў жыхароў нашай краіны эпохі раннеродавай абшчыны было, разам з традыцыйнымі рыбалоўствам і збіральніцтвам, загоннае паляванне. А гэта сведчыць аб пэўным узроўні развіцця тагачаснага грамадства.

Адкрыццё стаянак дало магчымасць шырокага вывучэння прылад працы той пары. У Юравічах знойдзены крамянёвыя нажы ў выглядзе апрацаваных тэхнікай рэтушы пласцін, скрабкі, праколкі, абломак капалкі, выраблены з біўня маманта, а таксама унікальны крамянёвы кінжал. Ёсць прыклады і верхнепалеалітычнага мастацтва ў выглядзе шліфаваных і штрыхаваных па ўсёй паверхні касцяных пласцін з нанесенымі геаметрычнымі ўзорамі шасцівугольнікаў і зігзагаў. Бердыжская стаянка акрамя вышэй пералічаных прылад прадстаўлена крамянёвымі наканечнікамі копьяў з бакавой выемкай, разцамі, рэтушорамі, з дапамогай якіх ішла апрацоўка будучых прылад працы, а таксама сякерападобнымі прыладамі.

Прыблізна каля 11 тыс. гадоў назад ледавік пачаў адступаць на поўнач. Паступова клімат станавіўся цяплейшым і каля 5 тыс. гадоў назад уступіў у фазу галацэну, тэмператур-

ны рэжым дасягнуў сучаснага кліматычнага оптымуму, што пацягнула за сабой змяненне флоры і фауны на тэрыторыі былой прыледніковай паласы. У раслiннасцi Беларусі цяпер пераважалі шырокалісцевыя і хваёвыя лясы. Жывёльны свет аказаўся прадстаўлены больш дробнымі ляснымі звярамі і птушкамі. Мамантаў, насарогаў і паўночных аленяў не стала.

Цесная сувязь старажытнага чалавека з навакольным асяроддзем і яго моцная залежнасць ад кліматычных і іншых прыродных умоў з-за нізкага ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл абумовіла, разам са змяненнем флоры і фауны, змяненне прывычнага ўкладу жыцця грамадства. Важнейшы, найбольш прадуктыўны занятак папярэдняга перыяду — загоннае паляванне — цяпер сыходзіць з гістарычнай арэны так, як буйныя жывёлы зніклі разам з пацяпленнем клімату.

Паляўніча-прамысловым відам жывёльнага свету ў гэты перыяд становяцца дробныя лясныя звяры і птушкі. Паляваць на іх можна было індывідуальна без збірання вялікай колькасці ўдзельнікаў, але патрэбна было валодаць сумай іншых спецыяльных ведаў, а таксама значна больш дасканалымі прыладамі працы, а не толькі палкай і каменем, прыдатнымі пры загонным паляванні. Жыццёвыя ўмовы, такім чынам, стымулявалі творчую думку грамадства, якая ў названы перыяд прывяла чалавека да вынаходніцтва лука і стрэлаў. Добрую дапамогу пры паляванні пачаў аказваць сабака — першая жывёла, якую змог прыручыць чалавек.

З 9-га тыс. да н.э., згодна з данымі навукі археалогіі, у гісторыі чалавецтва наступае новая археалагічная эпоха — сярэднекаменны век (мезаліт). Яго храналагічныя рамкі — 9—5-етыс. да н.э. Мезаліт з'явіўся завяршальнай стадыяй станаўлення родавага грамадства. За ім пачалася эпоха развітой родавай абшчыны.

У перыяд мезаліту чалавецтва зрабіла новы крок ва ўдасканаленні яшчэ аднаго старажытнага грамадскага занятку — рыбалоўства. Рыбу ў мезаліце ўжо лавілі вудай з прымяненнем касцяных кручкоў, якія археолагі ў вялікай колькасці зна-

ходзяць на стаянках той эпохі. Яе білі гарпунамі, перамяшчаючыся па вадзе на выдзеўбаных з дрэва чаўнах, і нават лавілі пры дапамозе рыбалоўных сетак, зробленых з кары лазы.

Развіццё прылад працы і ўдасканаленне відаў дзейнасці дало магчымасць працаваць больш дробнымі калектывамі, што, у сваю чаргу, вяло да драблення радоў. У гэты ж час значна павялічваецца колькасць насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Да сённяшніх дзён археолагі выявілі больш 120 стаянак эпохі сярэднекаменнага веку. Пастулова заселенай аказалася ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі.

З'яўляліся новыя роды, агульная колькасць родавых калектываў значна павялічылася. Узніклі цэлыя аб'яднанні роднасных па паходжанні родавых калектываў. Роднасць адрознівала іх ад суседніх аналагічных аб'яднанняў. Яны мелі свае асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры, сваю мову, тэрыторыю, своеасаблівыя абрадава-рэлігійныя і іншыя прыкметы. Усё пералічанае вышэй вылучала іх са структуры былой родавай арганізацыі грамадства і надавала рысы новай грамадскай супольнасці, якая ў гістарычнай навуцы атрымала назву "плямёны".

Плямёны фактычна з'яўляліся зародкавай стадыяй фарміравання этнічных супольнасцяў. Пастулова на тэрыторыі Еўропы аформілася некалькі этнакультурных абласцей. Іх наяўнасць археолагі вызначаюць шляхам выяўлення адрозненняў у спосабах выканання крамянёвых прылад працы. Так, адна з названых этнакультурных абласцей, што размяшчалася ў паўночнай і цэнтральнай частцы еўрапейскага кантыненту і была характэрна знаходкамі буйнапамерных (50—200 мм) прылад працы, выкананых з крамянёвых адшчэпаў і пласцін, у гістарычнай навуцы атрымала назву макралітычнай. На Беларусі макралітычныя прылады эпохі мезаліту выяўлены ў басейнах рэк Дзісна, Сож, а таксама ў некаторых заходніх раёнах. У іншых месцах сустракаюцца таксама рэгіёны з мікралітычным характарам выканання прылад працы.

Ідэалагічныя ўяўленні грамадства перыяду ранняй родавай абшчыны фарміраваліся пад уплывам пэўнага узроўню

свядомасці і паступовага накаплення ведаў аб навакольным асяроддзі. Людзі верылі ў звышнатуральныя сілы духаў (анімізм). Неадушаўлёныя прадметы і з'явы прыроды надзяляліся чалавечымі якасцямі (фетышызм). З пачаткам прыручэння жывёл і далейшым развіццём палявання, ад якога ў значнай ступені залежаў дабрабыт грамадскага існавання, у ідэалагічнай свядомасці з'явіліся ўяўленні пра татэмных, родных людзям жывёл (татэмізм). На татэмы, як правіла, забаранялася паляванне, перыядычна іх выявам прыносіліся ахвяраванні, на месцах іх устаноўкі маліліся і праводзілі агульнародавыя рытуалы.

Заняткі людзей перыяду раннеродавай абшчыны цалкам заставаліся тымі ж, што і ў папярэдні перыяд. Людзі па-ранейшаму вялі прысвойваючы лад жыцця, пры якім збіральніцтва, паляванне і рыбная лоўля заставаліся адзінай сферай грамадска-карыснай дзейнасці. Разам з тым адбылося ўдасканаленне прылад працы. Ішло пастаяннае накапленне вопыту, што перадаваўся як шляхам пераймання, так і, дзякуючы наяўнасці гукавой мовы, з пакалення ў пакаленне. Стыхійна адбываўся пастаянны неўсвядомлены чалавекам выхаваўча-адукацыйны працэс, новыя пакаленні людзей ведалі больш за сваіх продкаў, а гэта вяло да прагрэсу ўсяго чалавецтва.

## 4. Развіццё грамадства на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах развітой родавай абшчыны

Пачынаючы з 5-га тыс. да н.э. насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Беларусі ўступіла ў стадыю развітой родавай абшчыны. Яе існаванне супадае з археалагічным перыядам новакаменнага веку (неаліту: 5—1,8 тыс. гадоў да н.э.), што з'явіўся завяршальным этапам эпохі каменю і характарызаваўся найвышэйшымі дасягненнямі ў стварэнні прылад працы выкананых з крэйдавага крэменю і косці.

Пераход да развітой родавай абшчыны быў абумоўлены накапленнем вопыту ў розных галінах жыццядзейнасці грамадства. Адбыліся змены ў навакольным асяроддзі. Чалавек

вынайшаў новыя спосабы апрацоўкі каменю і косці, удасканаліў розныя формы здабывання сродкаў для існавання, зрабіў крок у накірунку аптымалізацыі шлюбных і ўвогуле сацыяльных адносін.

Клімат названага перыяду характарызаваўся наяўнасцю цёплай тэмпературы і высокага ўзроўню вільготнасці паветра нават у больш значнай ступені, чым ёсць у сучаснай Беларусі. Гэта спрыяла росту шыракалістых лясоў, дзе вадзілася вялікая колькасць звяроў і птушак. Равівалася паляванне. Прадуктыўна паляваць цяпер можна было, пражываючы пастаянна на адной і той жа тэрыторыі.

Яшчэ ў перыяд зыходжання ледавікоў, пры якіх утваралася значная колькасць талай вады, уся тэрыторыя нашай краіны пакрылася вялікай колькасцю рэк і азёраў. У неаліце іх выкарыстоўвалі ў якасці шляхоў зносін. Насельніцтву былі вядомы чаўны, платы і іншая плывучая тэхніка, дзякуючы выкарыстанню якой лягчэй было пераадольваць значныя адлегласці пры перамяшчэнні паляўнічай і іншай здабычы.

Шырока развівалася рыбалоўства. Як і раней, яно было адным з важнейшых відаў жыццядзейнасці чалавека. З удасканаленнем справы пляцення сетак, вынайдзенай у папярэдні перыяд, а таксама з выкарыстаннем новых відаў рыбалоўных прыстасаванняў, такіх як розныя канфігурацыі гарпуноў, зубчастыя коп'і, вуды з касцянымі кручкамі і іншыя снасці, рыбалоўства станавілася ўстойлівай крыніцай здабычы сродкаў грамадскага харчавання.

Узнялося на новую ступень развіцця збіральніцтва. Неалітычныя збіральнікі ўжо ведалі мноства новых уласцівасцяў жывой прыроды. Яны з лёгкасцю адрознівалі ядавітыя ці лячэбныя расліны ад тых, якія былі прыдатныя для ўжывання ў ежу. Паступова ў грамадскай свядомасці ўжо ішло і ўсведамленне гадавога цыкла: засявання, выспявання і адмірання раслін, якое спрыяла станаўленню мэтанакіраванай апрацоўкі глебы як самастойнага прадукцыйнага занятку.

Эпоха неаліту азнаменавалася значнымі адкрыццямі ў галіне накаплення людзьмі новых відаў прадметаў дамашняга ўжытку. Было вынайдзена ганчарства і ткацтва. Вытворчасць посуду ў той час мела своеасаблівы характар. Неалітычныя ганчары спачатку выцягвалі гліняную ленту з дабаўленнем невялікай колькасці пяску, а потым налеплівалі яе ў выглядзе спіралі да атрымання вострадоннай конусападобнай пасудзіны. Пасля загладжвання, нанясення арнаменту і абпальвання гаршчок можна было эфектыўна выкарыстоўваць для прыгатавання і захоўвання прадуктаў харчавання.

У гэты ж перыяд, прыблізна ў канцы неаліту і пачатку бронзавага веку, людзі вынайшлі ткацтва. Архаічны працэс стварэння адзення, які заключаўся раней у замацаванні асобных кавалкаў шкуры паміж сабой, з гэтага часу ўзняўся на больш высокую ступень развіцця. Выраб гістарычна першых тканін, на думку вучоных, быў ажыццёўлены неалітычнымі майстрамі на базе назапашанага раней вопыту пляцення рыбалоўных сетак.

Новы крок наперад чалавецтва быў зроблены і ў вытворчасці прылад працы. Прымяняліся невядомыя раней прыёмы пярвічнай і другаснай апрацоўкі крэменю. Было вядома свідраванне, рабочая паверхня апрацоўвалася шляхам шліхтавання і шліфавання, у залежнасці ад неабходнасці прымянялі розныя способы рэтушавання: плоскае, струменістае або пілаватае. Археолагі знаходзяць нават паліраваныя прылады працы эпохі неаліту.

Ішло пастаяннае ўдасканаленне прыёмаў і спосабаў вытворчасці прылад. У неаліце быў вынайдзены паўмеханізаваны лучковы спосаб свідравання. Пастуова прылады набылі найбольш аптымальныя формы, многія з якіх захаваліся да нашых часоў. Гэта свідраваныя каменныя сякеры і матыкі, нажы, сярпы, свёрдлы, праколкі, долаты, дзіды (коп'і), кінжалы і іншыя інструменты.

Стварэнне прылад працы ў неаліце набывае характар спецыялізацыі. Каб зрабіць патрэбны для выканання нейкай дзейнас-

ці інструмент, цяпер ужо не заўсёды хапала ўменняў звычайнага радавога чалавека. Патрэбна было спецыяльнае веданне спосабаў іх выканання, уласцівасцяў матэрыялу і іншыя навыкі. У гэты час з'явіліся людзі-майстры, якія амаль выключна спецыялізаваліся на выкананні прылад працы і прадметаў ужытку.

Асабліва цікавы прыклад спецыялізацыі знайшлі вучоныя-археолагі каля пасёлка Краснасельскі, што непадалёку ад горада Ваўкавыска Гродзенскай вобласці. Тут былі знойдзены унікальныя крэмнездабыўныя шахты 5—3-га тыс. да н.э., дзе старажытныя майстры выраблялі прылады працы з высокаэфектыўнай сыравіны, крэйдавага крэменю. Вывучаючы матэрыялы краснасельскага археалагічнага комплексу вучоныя прыйшлі да высновы, што на Беларусі ў той час ўжо існаваў нават пэўны тэрытарыяльны абмен, бо настолькі вялікая колькасць прылад працы не магла спатрэбіцца жыхарам адной адносна невялікай мясцовасці.

На перыяд неаліту прыпадае яшчэ адно важнае адкрыццё ў гісторыі першабытнага грамадства. Прыблізна каля 3,5 тыс. гадоў да н.э. пачаўся пераход старажытнага насельніцтва тэрыторыі нашай краіны ад прысваення да вытворчасці. Найстаражытнейшыя знаходкі, пацвярджаючыя наяўнасць вытворчых відаў дзейнасці на Беларусі, выяўлены археолагамі ў паўднёва-заходніх раёнах. Лічыцца, што распаўсюджванне вопыту вытворчых заняткаў ішло ад плямён Балканскага паўвострава праз Валынь.

Земляробства і жывёлагадоўля выклікалі сапраўдны пераварот у жыцці першабытнага грамадства ва ўсім Свеце. Значнасць пераходу ад прысваення да вытворчасці як гістарычнай з'явы падкрэсліваецца і тэрмінам "неалітычная рэвалюцыя", якім у гістарычнай навуцы прынята абазначаць гэты працэс. Нарэшце старажытным чалавекам была вырашана важнейшая праблема барацьбы за існаванне. Устойлівае забеспячэнне прадуктамі цяпер параўнальна менш залежала ад змянення прыродных умоў. Людзі атрымалі магчымасць накаплення лішкаў харчавання.

Але на Беларусі гэта адбылося не адразу, спатрэбіліся многія стагоддзі, пакуль усё насельніцтва дасканала авалодала названымі відамі дзейнасці. Прычынай паступовасці развіцця вытворчых заняткаў была, відаць, пэўная дастатковасць прадуктаў, здабываемых прысвойваючым шляхам ва ўмовах азёрна-лясістай мясцовасці нашай краіны ў адрозненне ад Паўднёвай і Заходняй Еўропы.

Паступовае развіццё прадукцыйных сіл вяло да значнага росту колькасці насельніцтва. На перыяд неаліту вучоныя-археолагі адносяць больш за паўтысячы стаянак, выяўленых да сённяшніх дзён у межах сучаснай тэрыторыі Беларусі. Насельніцтва нашай краіны складала ў гэты час прыблізна каля шасці тысяч чалавек. Шчыльнасць паселішчаў узрасла, як і ў мезаліце, заселенай была поўнасцю ўся сучасная тэрыторыя рэспублікі.

Шлюбныя адносіны, што вызначаліся цвёрдарэгламентаваным экзагамным шлюбным парадкам, які дзейнічаў на аснове звычаёвага права ў раннеродавым грамадстве, цяпер дапоўніліся эндагаміяй унутры племені. У шлюб уступалі прадстаўнікі розных радоў, якія мелі адну і тую ж племянную прыналежнасць.

Эндагамія значна ўзнімала ўзровень унутранай кансалідацыі племянных супольнасцяў. Члены суседніх плямён лічыліся чужынцамі, з імі, як правіла, не ўступалі ў блізкія адносіны. Рознасць моваў, іншы набор абраднасці і жыццёвых каштоўнасцяў іншапляменнікаў дзейнічалі як раздзяляючыя фактары. Разам з тым усё ж нейкія кантакты заставаліся, бо абмен вопытам жыццядзейнасці ў пэўнай ступені працягваўся паміж суседзямі. Сярод формаў шлюбных адносін унутры племені ў гэты час ідзе пашырэнне значэння парнай сям'і.

Унутрырадавая арганізацыя грамадства не адчула значных зменаў пры пераходзе да развітой абшчыны. Адзіная важная акалічнасць, што адрознівала чалавечыя супольнасці ад папярэдніх — рост ролі мужчынскай працы ў суме даходаў ад

дзейнасці ўсяго абшчыннага калектыву. Матрыярхат паступова пачаў падточвацца пашырэннем укладу мужчынскага насельніцтва галоўным чынам за кошт заняцця ім прагрэсіўнымі вытворчымі відамі дзейнасці. Родавы ж лад цалкам набыў грамадска ўсвядомленыя сталыя формы і развіваўся яшчэ пакуль на матрыярхальнай аснове.

У ідэалогіі, як і раней, пераважалі анімістычныя прыёмы ўсведамлення акружаючай рэчаіснасці. Для насельніцтва нашай краіны эпохі неаліту найбольш характэрнымі ідэалагічна-нагружанымі археалагічнымі знаходкамі з'яўляюцца выявы звяроў і птушак (татэмізм), што сведчыць аб значнай залежнасці жыцця тагачаснага чалавека ад водна-ляснога навакольнага асяроддзя. Традыцыйныя і для сучаснага беларуса культы бусла, качкі суіснавалі з шырока развітым у многіх народаў культам продкаў, добра бачным пры вывучэнні пахаванняў.

Людзі верылі ў "замагільнае" жыццё. Пакланенне духамахоўнікам (культ продкаў) трансфармавалася ва ўзнікненне мясцовых божастваў. Паступова расце агульная колькасць багоў і іншых культаў для пакланення. У грамадскай свядомасці замацоўваюцца спецыяльныя (для асобных відаў дзейнасці) культы, на падтрымку якіх разлічваюць пры выкананні розных спраў.

Рост колькасці насельніцтва, абумоўлены ў значнай ступені развіццём прадукцыйных сіл, прыводзіў да няспыннага росту колькасці родавых калектываў. Адбывалася гэта шляхам самараздзялення існуючых радоў на часткі для дасягнення большай мабільнасці і жыццядзейнасці калектываў. Роды, якія адпачкоўваліся, паступова станавіліся самастойнымі, у іх з'яўляліся ўласныя лідэры, афармлялася свая сістэма каштоўнасцяў і асабліваццяў унутрыродавага парадку.

Прыблізна такі ж працэс адбываўся і на племянным узроўні. З'яўленне вялікай колькасці радоў, размешчаных на значнай адлегласці ад многіх сваіх супляменных родавых арганізацый, часта вяло да таго, што паступова трациліся не-

пасрэдныя сувязі былога племяннога адзінства. Некалькі родаў аб'ектыўна (у выніку цячэння паўсядзённага жыцця і незалежна ад волі ці жаданняў іх членаў) абасабляліся ад былога плямені. Такім чынам, на этапе развітой родавай абшчыны ўзнікалі гістарычна новыя сацыяльныя супольнасці — саюзы плямёнаў. Менавіта яны, уяўляючы сабой этнакультурныя аб'яднанні, станавіліся зародкамі будучых этнасаў (народаў).

Тэрыторыі рассялення саюзаў плямёнаў, унутрана звязаных роднаснымі сувязямі, як правіла, фіксуюцца вучонымі-археолагамі па аднолькавасці рысаў матэрыяльнай культуры. Калі на этапе мезаліту даследчыкі вызначалі даволі цмянае, макра- і мікралітычнае падабенства ў выкананні прылад працы, то для характарыстыкі неаліту ўжо ёсць спецыяльны тэрмін "археалагічная культура", з дапамогай якога пазначаецца даволі шырокі спектр лакальных асаблівасцяў у знаходках прылад працы, керамічных вырабаў, пахаванняў, жыллёвых пабудоў і іншых паказчыкаў пражывання асобных этнакультурных супольнасцяў.

Вучоныя вызначаюць чатыры асноўныя культуры перыяду неаліту (умоўна названыя па месцах іх размяшчэння). У Браслаўскім паазер'і, ад міжрэчча "Днепр — Заходняя Дзвіна", на захад, уключаючы ўвесь прыбалтыйскі рэгіён, з 4-га тыс. па 300-я гг. 3-га тыс. да н.э., размяшчалася **нарвенская** археалагічная культура. Матэрыяльныя знаходкі **днепра-данецкай** культуры (5—2 тыс. гадоў да н.э.) археолагі ажыццявілі ў Сярэднім Падняпроўі і басейнах рэк Сож і Беразіна. Яе заходні рубеж знаходзіцца каля ракі Гарынь, а ўсходні сягае ажно да ракі Данец, што на тэрыторыі сучаснай Расіі. Паўночны Ўсход Беларусі ў напрамку ракі Ака і Валдайскага ўзвышша ад вусця Беразіны і Іпуці займала ў 4—2-ім тыс. да н.э. **верхнедняпроўская** культура. Захад Беларусі ў раёне цячэння рэк Прыпяць, Нёман і часткова ў басейне Віслы з сярэдзіны 5-га да 2-га тыс. да н.э. быў месцам рассялення плямёнаў **нёманскай** культуры.

Неалітычныя культуры, што размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі, мелі адну агульную для ўсіх асаблівасць. Керамічныя вырабы, знойдзеныя на месцах іх рассялення, мелі ўпрыгажэнне грабенчатага арнаменту. Вучоныя называюць гэтыя культуры познекраманьёнскімі, падкрэсліваючы тым самым, што створаны яны былі хутчэй за ўсё мясцовым насельніцтвам, якое пражывала на гэтых тэрыторыях з самай старажытнасці яшчэ да так званага вялікага перасялення народаў.

Калі зірнуць цалкам, то характар жыцця познекраманьёнскага насельніцтва на стадыі развітой абшчынна-родавай арганізацыі грамадства, вызначаўся: прысвойваючымі відамі дзейнасці, нягледзячы на першыя знаходкі прымет вытворчасці ў паўднёва-заходняй частцы краіны; панаваннем шліфаваных і свідраваных каменна-касцяных прылад працы; аімізмам у ідэалогіі, а таксама існаваннем такіх форм уласнасці, як племянная, родавая і абшчынная. Сям'я яшчэ не магла здабываць сама ўсё неабходнае для жыцця. Таму важнейшымі заняткамі, як і раней, заставаліся калектыўныя віды працы — рыбалоўства, паляванне, расчыстка палёў пад прымітыўнае земляробства і інш. Аднак паступовае развіццё прадукцыйных сіл пакрысе расхіствала ўстоі родавага ладу, падмацоўваючы тэндэнцыі да ліквідацыі матрыярхату і адасаблення сям'і як асобнай, найбольш дробнай вытворча-жыццёвай ячэйкі.

**Працяг будзе**

( *працяг артыкула В.А. Пілецкага ў часопісе*):
**Гісторыя: праблемы выкладання. 1999, №4. С.3–13.**

*Віктар Пілецкі, кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя М.Танка*

# Першабытны лад у гісторыі Беларусі

**Заканчэнне. Пачатак у № 3**

## 5. Перыяд разлажэння першабытнага ладу на Беларусі

Новы этап эвалюцыі першабытнага грамадства на тэрыторыі нашай Радзімы навукоўцы звязваюць з пачаткам шырокамаштабнай міграцыі насельніцтва, што пачалася прыблізна з 3-га тыс. да н.э. У гэты час на еўрапейскім кантыненце, ахапіўшы вялізную тэрыторыю ад ракі Рэйн, што ў Нямеччыне, да Волгі з захаду на ўсход і ад Днястра і Эльбы на поўдні да Скандынавіі на поўначы, рассяліліся новыя народы, прадстаўнікі культуры шнуравой керамікі.

У час міграцыі яны не выцяснялі мясцовага познекраманьёнскага насельніцтва, бо шчыльнасць засялення тэрыторый была у той час параўнальна невялікая. Асноўнымі адметнымі рысамі прышэльцаў былі адзіночныя пахаванні, баявыя лодкападобныя сякеры і ўпрыгажэнні на посудзе (кубкі) у выглядзе адбіткаў шнура, пакладзенага на сырую гліну.

Тэрыторыя, на якой рассяліліся шнуравікі, на думку большасці сучасных даследчыкаў, адпавядала рассяленню ў больш позні перыяд асноўных еўрапейскіх праэтнасаў (гер-

манцаў, балтаў і славян), што далі пачатак амаль усім сучасным еўрапейскім народам. Мяркуецца, што шнуравікі прынялі важны ўдзел ва ўтварэнні названых праэтнасаў, два з якіх (балты і славяне) з'яўляюцца продкамі беларускага народа. Непасрэднымі ж папярэднікамі балтаў і славян у сучаснай гістарычнай навуцы прынята лічыць старажытных індаеўрапейцаў.

Складаныя працэсы гістарычнай міграцыі вялікіх груп насельніцтва пакуль яшчэ не да канца асветлены даследчыкамі. Аднак ужо вядома, што старажытныя індаеўрапейцы як адзін з праэтнасаў сфарміраваліся на працягу розных перыядаў каменнага і бронзавага вякоў на вялікай тэрыторыі — прыблізна ад заходніх рубяжоў еўрапейскага кантыненту да межаў сучаснай Індыі.

Дыскусійнай застаецца праблема пошуку прарадзімы індаеўрапейцаў увогуле і асобных іх груп у прыватнасці. Адна з найбольш верагодных версій называе ў якасці агульнаіндаеўрапейскай прарадзімы мясцовасць Анатолію, што размешчана ва ўсходняй частцы сучаснай Турцыі. Прарадзімай арыйцаў, індаіранскай групоўкі старажытнага індаеўрапейскага праэтнасу, якая была непасрэдным этнічным коранем пры фарміраванні германцаў, балтаў і славян, з'яўлялася Паволжжа і Паўночнае Прычарнамор'е. З гэтых тэрыторый хутчэй за ўсё адбывалася засяленне еўрапейскага кантыненту, і сучаснай Беларусі ў тым ліку.

Індаеўрапейскі народ не быў адзіным пражываўшым у гэты перыяд на абшарах Еўраазіі праэтнасам. Яго суседзямі ў паўночна-ўсходнім накірунку былі фіна-угры, продкі сучасных комі-пермякаў, марыйцаў, мардвы, карэлаў, што з'яўляліся прадстаўнікамі ўральскай моўнай групы. Яны рассяліліся на вялікай тэрыторыі ад уральскіх гор да Скандынавіі, і ў працэсе сумеснага пражывання са славянамі на больш познім этапе гісторыі сталі этнічнымі каранямі пры ўтварэнні рускага народа. У паўднёвых раёнах сучаснай Украіны індаеўрапейскі праэтнас уступаў ва ўзаемадзеянне са скіфа-сармацкімі этніч-

нымі плынямі, вынікам чаго было ўзнікненне ў больш позні перыяд украінскага этнасу.

Мясцовае неалітычнае насельніцтва ў працэсе сумеснага пражывання паступова перамяшалася з прышэльцамі. Вынікам мяшання, засведчанага археолагамі, было паяўленне новых археалагічных культур, у якіх заўважаліся рысы шнуравой арнаментацыі керамікі. Як і ў папярэдні перыяд, на Беларусі размясціліся чатыры буйныя археалагічныя культуры. На поўначы Беларусі знаходзілася **паўночнабеларуская** культура, у заходняй частцы краіны (Панямонне) — вісла-нёманская, ва ўсходніх раёнах (Верхняе Падняпроўе і Усходняе Палессе) — **сярэднедняпроўская**, і на заходніх рубяжах у прыпяцка-бугскім рэгіёне, **шнуравой керамікі Палесся**.

Прышлыя народы вялі вытворчы лад жыцця. Асноўнай формай гаспадарання ў іх была жывёлагадоўля. Яны вырошчвалі галоўным чынам буйную рагатую жывёлу і вялі паўкачавы лад жыцця. Пераход з месца на месца дыктаваўся неабходнасцю пошуку новых багатых раслінНасцю лугоў для кармлення жывёлы. Другім па важнасці гаспадарчым промыслам было земляробства, але яно знаходзілася на першапачатковай прымітыўнай стадыі развіцця, што характарызавалася падсечна-агнявой сістэмай.

З 2-га тыс. да н.э. на Беларусі пачынаецца бронзавы век (2-е тыс. — сярэдзіна 1-га тыс. да н.э.). Яго пачатак звычайна звязваюць з прыходам названых народаў. Тым больш што мясцовай сыравіны для вырабу бронзавых прылад на тэрыторыі нашай краіны не выяўлена. Усе археалагічныя знаходкі бронзавых прадметаў, як паказалі даследаванні, былі або прывазныя, або створаныя з прывазной сыравіны, што мае паходжанне з Прыкарпацця ці Закаўказзя. Відаць, у выніку гэтага, а таксама па прычыне не намнога лепшых якасцяў, бронзавыя вырабы не змаглі выцесніць поўнасцю каменныя і касцяныя прылады працы ў гаспадарчым жыцці нашых продкаў.

Не адбылося таксама і канчатковага выцяснення прысвойваючых відаў дзейнасці ў выніку прыходу шнуравікоў. За-

няткі людзей пачатковага этапу бронзавага веку характарызаваліся сумяшчэннем як ранейшых промыслаў, так і новых форм гаспадарання — жывёлагадоўлі і земляробства. Пашырэнне вытворчага ладу жыцця ўсё ж адбылося, і асабліва яскрава гэта заўважаецца археолагамі на зменах, што адбыліся ў характары сацыяльных адносін.

У іерархіі сацыяльнай значнасці з пашырэннем вытворчых заняткаў больш важнае месца пачала займаць праца мужчын, якія выконвалі асноўныя функцыі ў жывёлагадоўлі і падсечным земляробстве. Гэта абумовіла змены ў шлюбна-сацыяльных адносінах. У эпоху бронзавага веку адбыўся пераход ад мацярынскага роду да патрыярхату. Пры заключэнні шлюбу з гэтага часу жанчына пачала пераходзіць у род мужчыны.

Не стаяла на месцы таксама развіццё прылад працы і прадметаў дамашняга ўжытку. Для іх вытворчасці цяпер выкарыстоўвалі ўжо не толькі крэмень і косці, а нават цвёрдыя пароды каменю, такія як граніт. Удасканальваліся і формы апрацоўкі — шліфаванне, свідраванне, паліраванне. Далейшае развіццё адбылося ў ганчарстве і ткацтве. З'явіліся керамічныя вырабы, разнастайна арнаментаваныя і рознай канфігурацыі, якая залежала ад іх практычнага прызначэння — пласкадонныя, кругладонныя, слоікападобныя і інш. Жытло чалавека гэтага перыяду ўяўляла наземныя пабудовы слупавой канструкцыі з выкладзенымі каменем ачаговымі паглыбленнямі. Пасёлкі плошчай 0,2—0,5 га размяшчаліся часцей за ўсё на ўзбярэжжах рэк і азёр у непасрэднай блізкасці да свабодных зямельных плошчаў, прыдатных для прымітыўнага земляробства і жывёлагадоўлі.

Развіццё прадукцыйных сіл непазбежна вяло да росту колькасці прадуктаў, здабываемых асобным вытворчым калектывам. Склалася новая сітуацыя ў грамадскім спажыванні вынікаў працы. Цяпер не ўсе прадукты, што здабываліся, ішлі на непасрэднае ўжыванне ў ежу. З'явіліся лішкі, што ў гістарычнай навуцы атрымалі назву "прыбавачны прадукт". Яго можна было выкарыстоўваць для абмену або накаплення.

Пачалося сацыяльнае расслаенне родавых абшчын на багатых і бедных членаў. Такое становішча ў грамадстве, якое пражывала на тэрыторыі нашай Беларусі ў перыяд бронзавага веку, яскрава падцверджана данымі археалагічных даследаванняў.

Так ужо ў раннебронзавых магільніках, выяўленых на тэрыторыі Падняпроўя (Ходасавічы Рагачоўскага раёна) сустракаюцца надзвычай багатыя пахаванні мужчын-ваяроў з вялікай колькасцю медных і бронзавых рэчаў, а таксама з бурштынавымі і шклянымі ўпрыгажэннямі. Пры жыцці, відаць, гэтыя людзі займалі больш значнае становішча, чым іх суродзічы. Яны маглі быць кіраўнікамі саветаў старэйшын або ваеннымі начальнікамі, ці выконвалі функцыі жрацоў-вешчуноў.

Пашырэнне вытворчых відаў дзейнасці, што абумовіла рэзкае развіццё грамадскіх прадукцыйных сіл, паступова вяло да індывідуалізацыі вытворчасці. Былая родавая ўласнасць пачала выступаць у форме сукупнасці асобных яе частак. Усё большае значэнне стала набываць сям'я. Патрыярхальныя сем'і цяпер, а не роды, як раней, станавіліся асноўнымі вытворчымі адзінкамі ў грамадстве. Але іх склад яшчэ быў даволі шырокі, яны часцей за ўсё ўключалі розныя пакаленні найбольш блізкіх родзічаў і налічвалі некалькі дзесяткаў чалавек. Кіраваў патрыярхальна-сямейным калектывам звычайна галава сям'і — бацька. Разам з ім працавалі яго жонка, жанатыя сыны, унукі, а часта і праўнукі ці іншыя родзічы.

Разлажэнне першабытнага ладу адбывалася не толькі па шляху развіцця маёмаснай няроўнасці і індывідуалізацыі вытворчасці. Трацiліся нават тэрытарыяльныя і іншыя традыцыйныя для абшчынна-родавага ладу сацыяльныя функцыі. Паколькі знікла неабходнасць працаваць родавым калектывам, то на месцах былых тэрыторый, дзе размяшчаліся асобныя роды, пачалі сяліцца сем'і — выхадцы з іншых родаў і плямёнаў. А гэта азначала, што на змену родавай абшчыне як гістарычнай з'яве паступова прыйшла новая сацыяльная супольнасць —

"суседская", ці, як яе яшчэ называюць у гістарычнай навуцы, "тэрытарыяльная" абшчына.

Кіраўніцтва тэрытарыяльнай абшчынай знаходзілася ўжо ў руках патрыярхальнай знаці. Прадстаўнікі родавых саветаў старэйшын, роднасна звязаныя і маёмасна роўныя паміж сабой, што кіравалі грамадствам у папярэдні перыяд, адышлі ў нябыт. Гэта вяло да новых аспектаў у сацыяльных узаемаадносінах тагачаснага грамадства. Патрыярхальная знаць, як правіла, любымі шляхамі імкнулася да ўзбагачэння. Яна выкарыстоўвала сваё прывілеяванае становішча ў грамадстве і хутка багацела. Гэтаму спрыяла крушэнне традыцый і звычаёвых законаў першабытнага родавага грамадства, а таксама паступовая страта роднасных сувязяў паміж суабшчыннікамі ва ўмовах тэрытарыяльна-суседскай супольнасці.

Калі звычайныя шляхі акумуляцыі багаццяў у руках знаці вычэрпваліся, то распачыналіся войны з суседзямі. Колькасць ваенных сутыкненняў паміж асобнымі тэрыторыямі ў гэты перыяд значна павялічылася. У час войнаў захоплівалі статкі жывёлы, лішкі прадуктаў, прадметы раскошы, прылады працы і нават няволькікаў для выкарыстання іх у якасці рабоў. Пачало фарміравацца патрыярхальнае рабства, якое, у адрозненне ад класічнага, не абышло і тэрыторыю нашай Беларусі. Завяршальная стадыя трансфармацыі першабытнага грамадства ў класавае пад уплывам вышэйпералічаных фактараў у гістарычнай навуцы атрымала назву "ваенная дэмакратыя". Яе працягласць звычайна залежала ад інтэнсіўнасці працэсу станаўлення новага грамадска-эканамічнага ладу.

Небывалае паскарэнне тэмпаў разлажэння першабытнага абшчынна-родавага ладу ў Беларусі адбылося з пачаткам вырабу жалезных прылад працы. Жалезны век — самы кароткі археалагічны перыяд. Яго працягласць ахапіла нямногім больш за тысячагоддзе (з VI—VII ст. да н.э. да VIII ст. н.э). Менавіта ў перыяд жалезнага веку адбыўся канчатковы распад рода-

вых адносін, станаўленне класавага грамадства і зараджэнне першых форм дзяржаўнасці на тэрыторыі сучасных усходнееўрапейскіх краін.

Сярод прылад працы ў эпоху жалеза найбольш прадукцыйнае месца займала сякера. Яе выкарыстоўвалі пры расчыстцы палёў пад прымітыўнае земляробства, якое ў гэты перыяд мела падсечны (пераложны) характар. Адносна нізкі ўзровень агратэхнічных ведаў, адсутнасць сістэмы ўгнойвання глебы не дазвалялі выкарыстоўваць адзін і той жа ўчастак зямлі пад пасевы на працягу многіх гадоў. Практыкавалася высяканне і спальванне лясных дзялянак, на месцы якіх высявалі збожжава-бабовыя культуры, а попел прымянялі ў якасці ўгнаення. Разам з сякерай выкарыстоўвалі барану-сукаватку, зробленую з вершаліны дрэва, матыку, саху (рала) з жалезным нарогам і іншыя прылады.

Сыравіну для вырабу прылад працы ў гэты перыяд здабывалі сырадутным спосабам. Руду з высокім утрыманнем жалеза балотнага паходжання, што ў даволі значнай колькасці знаходзілася тады асабліва на тэрыторыі Усходняй Беларусі (аб чым сведчыць частае размяшчэнне тапонімаў з каранямі "руда", "рудніца" ў Падняпроўі і Пасожжы), засыпалі ў печыдомніцы, чаргуючы з пластамі драўлянага вугалю. Нагнятаючы паветра на запалены вугаль, выплаўлялі порыстую жалезную масу "крыцу", з якой шляхам пракоўвання выраблялі высокаэфектыўныя прылады працы.

Жалезныя прылады працы яшчэ больш узнялі прадукцыйнасць грамадскай вытворчасці. Земляробства і жывёлагадоўля паступова занялі месца асноўных відаў дзейнасці. Усё разам дало магутны штуршок пашырэнню маёмаснай няроўнасці і далейшаму развіццю працэсаў разлажэння родавых адносін у Беларусі. Сельская тэрытарыяльная абшчына ў гэты час была сацыяльнай арганізацыяй, на базе якой паступова фарміравалася класавае грамадства. Сям'я канчаткова стала асноўнай вытворчай адзінкай, а сямейная ўласнасць — асноўнай формай уласнасці ў грамадстве. З ростам прадукцый-

насці працы адбывалася памяншэнне колькаснага складу патрыярхальнай сям'і.

Палітра археалагічных культур у эпоху жалеза на Беларусі была адносна зменлівая, што сведчыць аб пэўнай інтэнсіўнасці міграцыйных працэсаў. У раннім жалезным веку насельніцтва нашай краіны складалі некалькі буйных груп плямёнаў, якія мелі свае характэрныя прыкметы матэрыяльнай культуры. Усход сучаснай Літвы і ўсю цэнтральную частку Беларусі ў VII ст. да н.э — V ст. н.э засялялі балцкія плямёны культуры **штрыхаванай керамікі**, якая ўзнікла на аснове мясцовых культур бронзавага веку. Іх жытло, па сведчанню археолагаў, мела выгляд слупавой канструкцыі, падзеленай на адносна невялікія камеры для пражывання асобных сем'яў. Такія пабудовы — яшчэ адна выразная пацвярджальная рыса наяўнасці патрыярхальнага ладу на тэрыторыі нашай краіны ў той час.

Сярэдняе і Верхняе Падняпроўе ў межах сучасных Гомельскай, Магілёўскай, усходняй часткі Брэсцкай, паўднёвай Мінскай абласцей і паўночнай часткі Украіны з VII па III ст. да н.э. было заселена **мілаградскімі** плямёнамі. Значная колькасць сучасных даследчыкаў лічаць мілаградцаў балтамі. Яны выраблялі кругладонны посуд, мелі своеасаблівы тып жылых пабудоў слупавой і паўзямлянкавай канструкцый, а таксама свой пахавальны абрад.

У канцы 1-га тыс. да н.э. на месцы знаходжання значнай часткі мілаградскіх плямёнаў у Верхнім і Сярэднім Падняпроўі сфарміравалася новая археалагічная культура — **зарубінецкая**. Вучоныя яшчэ не выпрацавалі адзінага погляду на праблему этнічнага паходжання гэтага насельніцтва. Некаторыя лічаць яго прамежкавай балцка-славянскай супольнасцю, другія — праславянамі ці нават прадстаўнікамі германа-гальскай этнічнай групоўкі. Зарубінцы ведалі ўжо спосаб вырабу жалезных прылад працы, мелі асобныя рысы керамікі, свой пахавальны абрад, будавалі аднакамерныя прамавугольныя наземныя і паўзямлянкавыя жыт-

лы з двухсхільнымі дахамі, былі маёмасна няроўныя ў сацыяльным жыцці.

**Паморская** культура, насельніцтва якой большасць вучоных лічыць самымі ранніми славянамі на тэрыторыі Беларусі, размяшчалася на паўднёвым захадзе з VII па II ст. да н.э. Гэта таксама была высокаразвітая на той час сацыяльная супольнасць, якая актыўна займалася вытворчымі відамі дзейнасці і асвоіла іх адна з першых сярод астатніх рэгіёнаў нашай краіны. Сацыяльная структура грамадства ў паморцаў характарызавалася патрыярхальна-родавымі адносінамі, пахавальны абрад — трупаспаленнем. Жыллёвыя пабудовы ў іх былі наземныя, у некаторых выпадках нават абкладзеныя камянямі (вёска Кусічы Камянецкага раёна).

Беларускае Падзвінне і Падняпроўе (верхняе), ахопліваючы паўночную частку Беларусі, прыблізна тую, на якой у больш позні час рассяляліся крывічы, займалі з VIII ст. да н.э. па VI ст. н.э. балцкія плямёны, прадстаўнікі **днепрадзвінскай** археалагічнай культуры. На поўначы насельніцтва гэтай культуры актыўна кантактавала з фіна-угорскімі плямёнамі, пра што сведчаць знаходкі тэкстыльна-арнаментаванай керамікі, характэрнай для названай этнічнай супольнасці. Жытлы днепра-дзвінцаў былі наземныя, слупавой канструкцыі, што аб'ядноўваліся ў невялікія ўмацаваныя пасёлкі-гарадзішчы. Посуд быў гладкасценны, у асноўным слоікападобных формаў.

Новыя міграцыйныя перамены на Беларусі адбыліся ў VI—VIII стст. н.э. Гэта быў перыяд так званага вялікага перасялення народаў, што цягнуўся ў гісторыі Еўропы з IV па VI ст. н.э. Прычынай пачатку масавай міграцыі вялізных груп насельніцтва ў гэты час з'явілася перамяшчэнне з азіяцкага на еўрапейскі кантынент качавых народаў — гунаў. Вынікі перасялення для сусветнай гісторыі былі глабальныя: падзенне Рымскай імперыі, новая этнічная, дзяржаўная і ваенна-палітычная сітуацыя ў Еўропе. Для Беларусі гэтыя часы таксама прынеслі карэнныя змены. Важнейшай з іх была этнічная:

прыход славянскіх народаў, якія ў працэсе сумеснага жыцця змяшаліся з мясцовым балцкім насельніцтвам, на працягу некалькіх стагоддзяў утварылі новую этнічную супольнасць — **беларускі народ**.

Ідэалагічна-рэлігійная свядомасць грамадства — параўнальна больш кансерватыўная сфера ў сацыяльнай эвалюцыі — тым не менш таксама не заставалася без змен у эпоху бронзы і жалеза на тэрыторыі нашай краіны. Развіццё жывёлагадоўлі і земляробства, накапленне большай колькасці ведаў пра навакольнае асяроддзе вялі да з'яўлення новых элементаў у грамадскім ідэалагічна-рэлігійным светаўспрыманні. Разам з пакланеннем татэмам і фетышам, існаваннем культу продкаў і веры ў багінь, якія з даўніх часоў суправаджалі жыццёвы шлях жыхара старажытнай Беларусі, у эпоху жалеза інтэнсіўна развіваецца мнагабожжа.

У навуковай гістарычнай літаратуры мнагабожжа звычайна ўжываецца пад назвай "язычніцтва". Разам з тым да сённяшніх дзён захаваўся і спалітызавана-зневажальны тэрмін "паганства", які некаторыя аўтары па няведанню ўжываюць нават у сучасных вучэбных дапаможніках. Яго з'яўленне адносіцца да самага пачатку барацьбы хрысціянства з язычніцтвам у раннесярэднявечную эпоху, калі апалагеты царкоўна-палітычных структур такім чынам называлі гэту форму рэлігіі. Галоўнай іх задачай было ў той час любымі шляхамі мінімізаваць фундаментальнае значэнне названай ідэалогіі ў грэка-рымскай класічнай культуры, навукі і адукацыі, чым спрыяць ліквідацыі сацыяльнай апоры ў яе прыхільнікаў.

З'яўленне новай формы рэлігіі, згодна з меркаваннем вучоных, адбылося пастунова пад уплывам развіцця вытворчых відаў дзейнасці ў першабытным грамадстве. Кожны поспех ці няўдача пры выкананні асобных жыццёванеабходных грамадскіх заняткаў асацыяваўся ў свядомасці тагачаснага чалавека з пакравіцельствам або незадаволенасцю асобнага бажаства. Узніклі так званыя жывёлагадоўчыя

і земляробчыя культы. Яны, як правіла, адрозніваліся ў розных этнасаў назвамі багоў, але "выконвалі" прыблізна аднолькавыя функцыі. Важнейшымі ў жыхароў старажытнай Беларусі, па сведчанні этнографаў, былі Пярун — бог грому, маланкі і вайны; Вялес — абаронца жывёл, жывёлаводаў і жывёлагадоўлі; Ярыла — бог вясенняй урадлівасці палёў і пакравіцель цяжарнасці ў жанчын; Сварожыч з Дажбогам, якія разам са сваім бацькам Сварогам "рэгулявалі" адпаведна пытанні нябеснага агню і вады, а таксама Зюзя — бог холаду і інш.

Апошні перыяд разлажэння родавага ладу, характэрны частымі ваеннымі сутыкненнямі і ростам ролі ўзброеных людзей, з якіх у больш позні перыяд фарміраваліся княжацкія дружыны, быў адзначаны важнымі зменамі і ў ідэалагічнай свядомасці грамадства старажытнай Беларусі. У гэты час з'явіўся своеасаблівы "ваенна-дружынны культ Перуна" (у суседніх кіеўскіх землях, як сведчаць пісьмовыя дакументы, адбылася нават спроба яго афіцыйнага афармлення). Язычніцкае бажаство Пярун і раней займала адно з першых месцаў у пантэоне (пераліку) беларускіх багоў, а на момант усталявання феадальных адносін увогуле набыло рысы вярхоўнага бога. Гэтым, з аднаго боку, адлюстраваўся аб'ектыўны працэс падзелу грамадства на класы з непазбежным ростам значнасці культу вайны ў названы перыяд, а з другога — суб'ектыўнае жаданне патрыярхальна-княжацкай адміністрацыі ў дахрысціянскі перыяд набыць ідэалогію, якая б абараняла яшчэ кволыя парасткі іх панавання ў новай форме арганізацыі грамадства — дзяржаўнасці.